# Паглыбленне ў мастацкі твор

## Рэалізацыя эўрыстычнага метаду навучання на ўроках літаратурнага чытання праз розныя віды аналізу тэксту

Навучанне — складаны працэс, які прадугледжвае, перш за ўсё, дзейнасць настаўніка і дзейнасць вучняў. У сучасных умовах неабходна больш увагі надаваць развіццю творчых здольнасцяў навучэнцаў, іх пазнавальным патрэбнасцям і інтарэсам.

На ўроках літаратурнага чытання шырокае выкарыстанне атрымаў эўрыстычны метад, мэта якога — дапамагчы школьнікам засвоіць твор, асэнсаваць яго, вырашыць узнікшыя маральныя, сацыяльныя, мастацкія праблемы; вучыць аналізаваць твор, разумець яго адзінства ў разнастайнасці кампанентаў, вучыць разважаць, афармляць свае думкі пры дапамозе слоў у звязным, паслядоўным, доказным маўленні — вусным або пісьмовым [4].

Адным з прыёмаў рэалізацыі гэтага метаду з'яўляецца навучанне школьнікаў аналізу тэксту мастацкага твора, аналізу эпізоду, некалькіх узаемазвязаных эпізодаў цэлага твора; вобразаў герояў, мовы, кампазіцыі твора, супастаўленне розных твораў. На ўроках літаратурнага чытання эфектыўным з'яўляецца выкарыстанне стылістычнага, праблемнага і кампазіцыйнага аналізу тэксту.

**Стылістычны (моўны) аналіз тэксту** паказвае дзецям, як у падборы слоў-вобразаў праяўляюцца аўтарскія адносіны да таго, што адлюстроўваецца. Паколькі словы мнагазначныя, то тлумачацца не словы, а вобразы, створаныя з гэтых слоў. Для моўнага аналізу выбіраюцца такія словы і выразы, якія дапамагаюць лепш зразумець вобразны сэнс твора (малююць карціны прыроды, перадаюць аўтарскія пачуцці) і ў той жа час з'яўляюцца найбольш выразнымі і дакладнымі. Пасля выдзялення слова або выразу ўсведамляецца іх роля ў тэксце, г. зн. вызначаецца, якія думкі і пачуцці ў іх заключаны.

Каб правесці стылістычны эксперымент па замене аўтарскага слова сінонімам, задаюцца пытанні: як можна сказаць па-іншаму? а як лепш? чаму?

**Праблемны аналіз** праводзіцца тады, калі ў творы вырашаюцца этычныя праблемы і магчыма рознае разуменне характараў герояў, іх дзеянняў, учынкаў. Праблемная сітуацыя на ўроку ствараецца з апорай на маральныя калізіі і падзейную аснову твора. Спачатку фармулюецца праблемнае пытанне, якое адпавядае наступным патрабаванням:

а) наяўнасць супярэчнасці і магчымасць альтэрнатыўных адказаў;

б) ёмістасць, здольнасць ахапіць не адзінкавы факт, а шырокае кола матэрыялу;

в) адпаведнасць характару твора;

г) захапляльнасць.

Для пераўтварэння праблемнага пытання ў праблемную сітуацыю супярэчнасць абвастраецца:

- супастаўляюцца розныя варыянты адказаў;
- настаўнік выказвае ад свайго імя сумніўную або нават няправільную трактоўку ўчынку, падзеі, вобраза.

Дзякуючы праблемнаму аналізу дзеці заўважаюць сувязь асобных элементаў мастацкага тэксту з агульнай канцэпцыяй твора.

**Кампазіцыйны аналіз** прадугледжвае работу над сюжэтам і яго элементамі (главамі, эпізодамі і г. д.). Дзеці назіраюць, як кампазіцыя адлюстроўвае логіку аўтарскай думкі. Аналіз часцей за ўсё пачынаюць з ключавой, кульмінацыйнай сцэны, дзе закрануты галоўныя пытанні, якія хвалююць пісьменніка. Спецыяльную работу праводзяць таксама над пачаткам (экспазіцыяй і завязкай) і канцоўкай (развязкай) твора.

Прымяняюцца плакаты з назвамі кампазіцыйных элементаў: уступ, завязка, развіццё дзеяння, кульмінацыя, развязка. Выкарыстоўваюцца пытанні тыпу: што, дзе, калі адбылося? чаму? што зрабіў герой? як гэта яго характарызуе? а што адбылося ў выніку гэтага? і г. д. Калі не супадаюць сюжэт твора (мастацкая паслядоўнасць асноўных эпізодаў) і фабула (храналагічная паслядоўнасць), праводзіцца іх супастаўленне, каб зразумець, з якой мэтай аўтар вырашыў змяніць ход падзей у тэксце [3].

Праілюструем выкарыстанне розных відаў аналізу тэксту пры працы з апавяданнем *М. Янчанкі* ***"А таму!"*** [1; 2].

### ПЕРШЫ СІНТЭЗ

***Уступная гутарка з дзецьмі***

Ці збіралі вы калі-небудзь грыбы ў лесе? З кім вы гэта рабілі? Чаму? Ці можна назваць вашага дзядулю (бабулю, тату і інш.) добрым грыбніком? Якія правілы паводзін трэба захоўваць у лесе грыбнікам?

**Настаўнік.** Сёння мы пазнаёмімся з апавяданнем Міколы Янчанкі "А таму!". Героямі яго з'яўляюцца дзеці-грыбнікі.

Педагог звяртае ўвагу школьнікаў на словы, запісаныя на дошцы, тлумачыць іх значэнне:

*апусціць вочы долу* — вінавата апусціць вочы ўніз;

*няёмка* — у тэксце: сорамна;

*нечаканасць* — раптоўнасць, неспадзяванасць, *рус.* неожиданность.

Настаўнік выразна чытае тэкст.

***Гутарка на праверку першага ўспрымання***

Хто з герояў апавядання вам спадабаўся, а хто не спадабаўся? Чаму?

### АНАЛІЗ

Паўторнае перачытванне тэксту дзецьмі.

Куды выправіліся Змітрок, Валодзя і Маня? Хто папрасіўся разам з імі? Знайдзіце і прачытайце, як пра гэта напісана ў апавяданні. *(Ромка таксама ўхапіў кошык ды на вуліцу. — І мяне вазьміце.)* Якім словам можна замяніць дзеяслоў *ухапіў*? *(Узяў.)* Чаму аўтар выбірае менавіта слова *ўхапіў* для характарыстыкі дзеянняў Ромкі? Ці пагадзіліся старэйшыя дзеці ўзяць з сабой малога? Аб чым яны папярэдзілі яго?

Блізка ці далёка ад вёскі знаходзіўся лес? Якія словы вам гэта падказалі? *(Да лесу "рукой падаць".)* Паспрабуйце замяніць у сказе выраз *рукой падаць* сінонімам *блізка*. Які сказ атрымаўся? Як вы думаеце, чаму аўтар выкарыстаў у тэксце менавіта выраз *рукой падаць*?

Знайдзіце і прачытайце, як дзеці разышліся ў лесе. Як сказ *А Ромка бачком, бачком, ды налева* характарызуе хлопчыка? Які Ромка? *(Хітраваты.)* Якія словы вам гэта падказалі? *(Бачком, бачком.)*

Знайдзіце і прачытайце, як Ромка збіраў грыбы. Як вы думаеце, якім грыбніком быў хлопчык? Чаму? Хто навучыў хлопчыка збіраць грыбы?

Што рабілі астатнія дзеці, пакуль Ромка збіраў грыбы? Чаму Ромка не адгукаўся? Знайдзіце і прачытайце. *(Яшчэ сюды прыбягуць і мае баравікі пахапаюць.)* Як гэта характарызуе яго? *(Прагны — рус. жадный.)*

Калі Ромка пабег да сяброў? *(Калі зразумеў, што дзеці далёка, і спалохаўся, што можа адстаць ад іх, згубіцца.)*

Знайдзіце і прачытайце, як сустрэлі Ромку сябры.

*— Дзе гэта ты быў? — незадаволена сустрэў яго Змітрок. — Мы ўсе ногі пазбівалі, цябе шукаючы.*

*— Заблудзіўся я, — зманіў Ромка і апусціў долу вочы. — Адышоў ад вас і заблудзіўся.*

*Падбеглі Валодзя і Маня.*

*— А мы цябе шукалі, шукалі, — пачала сыпаць Маня. — Думалі ўжо ў вёску бегчы ды старэйшых клікаць...*

*— Дадому час, — спыніў яе Змітрок і звярнуў на дарогу.*

Чаму Змітрок быў незадаволены? *(Таму што ён увесь час да гэтага хваляваўся і бегаў па лесе, ён стаміўся.)* Якія словы Змітрака падказваюць нам, што дзеці ўвесь час да гэтага бегалі па лесе, шукалі таварыша і нават стаміліся? *(Усе ногі пазбівалі.)* Паспрабуйце прачытаць словы хлопчыка незадаволена.

Што сказала Ромку Маня? *(Што яго ўсе шукалі і нават збіраліся ісці за старэйшымі.)* Як яна гэта сказала? *(Хутка.)* Якія словы аўтара гэта падказалі? *("Пачала сыпаць", тут сыпаць словамі — гаварыць вельмі хутка.)* Чаму яна гаварыла вельмі хутка? *(Ад хвалявання.)* Паспрабуйце прачытаць словы дзяўчынкі хутка, з хваляваннем.

Што адказаў Ромка сябрам? Чаму ён апусціў долу вочы? Як гэта характарызуе хлопчыка? *(Ён падманшчык, але разумее, што падманваць дрэнна, і адчувае сябе вінаватым.)* Як трэба прачытаць яго словы? Паспрабуйце прачытаць словы Ромкі вінавата.

Якімі словамі Змітрок спыніў усе размовы ў лесе? *(— Дадому час, — спыніў яе Змітрок і звярнуў на дарогу.)* Як ён гэта сказаў, як вы думаеце? *(Рашуча.)* Чаму? Паспрабуйце прачытаць словы хлопчыка рашуча.

Вучні выразна чытаюць урывак тэксту па ролях.

З якім настроем Ромка вяртаўся ў вёску? Знайдзіце і прачытайце. Якімі словамі і вобразнымі выразамі аўтар характарызуе яго настрой? *(Няёмка, ішоў апусціўшы галаву, настрой узняўся.)* Чаму яго настрой змяніўся з сумнага на вясёлы? *(Яму было прыемна, што яго хваляць дарослыя.)*

Якімі словамі сустрэла дзяцей маці? Знайдзіце і прачытаце.

*— Глядзі ты, — дзівілася маці, — такі малы, а поўны кошык баравічкоў набраў. А ты, Змітрок, пэўна, варон лічыў. Толькі дно закрыў.*

Як адчуваў сябе Змітрок пасля такіх слоў маці? *(Яму было крыўдна.)* Што хацеў сказаць ён маці? Знайдзіце і прачытайце.

*Хацеў Змітрок сказаць, што не да баравікоў яму было, што вось гэтага Ромку шукаў, ды змаўчаў.*

Чаму аўтар выкарыстаў менавіта такія выразы: *не да баравікоў яму было, вось гэтага Ромку шукаў*?

Як вы думаеце, чаму Змітрок нічога не сказаў дарослым? Ён пабаяўся, ці быў высакародным чалавекам, не дробязным, не хацеў, каб пачалі папраць Ромку, прымяншаць яго дасягненні як грыбніка?

Ці зразумеў Ромка, што паступіў з таварышамі дрэнна? *(Не.)* Які ўчынак хлопчыка пра гэта сведчыць?

Знайдзіце і прачытайце тую частку тэксту, у якой перадаецца размова дзяцей перад паходам у лес на наступны дзень.

*Назаўтра Ромка сам да Змітрака пайшоў. Там Валодзю і Маню застаў. З кошыкамі.*

*— І я з вамі! — гукнуў Ромка.*

*— Не, — панура адказаў Змітрок, — мы цябе з сабой не возьмем.*

*— А чаму?*

*— А таму! — адказаў за Змітрака Валодзя.*

Давайце паспрабуем прачытаць размову дзяцей па ролях. Як трэба прачытаць словы Ромкі? *(Радасна, з інтарэсам.)* Што вам падказала гэта? *(Словы аўтара — "гукнуў Ромка".)* Як трэба прачытаць словы Змітрака? *(Панура, нявесела.)* Чаму? *(Словы аўтара — "панура адказаў Змітрок".)* Як трэба прачытаць словы Валодзі? *(Гучна, рашуча.)* Чаму? *(Таму што ў канцы слоў Валодзі стаіць клічнік. Хлопчык агучыў агульнае рашэнне дзяцей.)*

Выразнае чытанне ўрыўка тэксту па ролях.

? Як вы думаеце, чаму дзеці не захацелі ўзяць Ромку з сабой у лес яшчэ раз? Ці растлумачылі яны яму сваё рашэнне?

Ці правільна яны зрабілі? *(Праблемнае пытанне.)*

Як вы думаеце, чаму Мікола Янчанка выбраў для апавядання менавіта такую назву: "А таму!"?

***Работа над планам***

**Настаўнік.** На колькі частак можна падзяліць гэтае апавяданне? *(На 4.)* Пра што будзе ісці размова ў першай частцы? *(Пра тое, як дзеці збіраліся ісці ў грыбы.)* Укажыце межы часткі. Выберыце словы ў тэксце, якія могуць стаць назвай часткі. *(І мяне вазьміце!)*

Пра што будзе ісці размова ў другой частцы? *(Пра тое, як Ромка збіраў грыбы.)* Укажыце межы часткі. Выберыце словы ў тэксце, якія могуць стаць назвай часткі. *(Яшчэ сюды прыбягуць і мае баравікі пахапаюць.)*

Пра што будзе ісці размова ў трэцяй частцы? *(Пра тое, як Ромка знайшоўся і падмануў таварышаў.)* Укажыце межы часткі. Выберыце словы ў тэксце, якія могуць стаць назвай часткі. *(А мы цябе шукалі, шукалі.)*

Пра што будзе ісці размова ў чацвёртай частцы? *(Пра тое, як маці хваліла Ромку і дакарала старэйшых дзяцей.)* Укажыце межы часткі. Выберыце словы ў тэксце, якія могуць стаць назвай часткі. *(Мы цябе з сабой не возьмем.)*

На дошцы запісваецца цытатны план:

1. І мяне вазьміце!
2. Яшчэ сюды прыбягуць і мае баравікі пахапаюць.
3. А мы цябе шукалі, шукалі.
4. Мы цябе з сабой не возьмем.

**Настаўнік.** Да якой часткі тэксту падыходзіць ілюстрацыя ў кнізе? Да якой яшчэ часткі апавядання вы б хацелі зрабіць малюнак? Што б вы на ім намалявалі? Апішыце словамі.

***Складанне характарыстыкі герояў***

**Настаўнік.** Давайце паспрабуем ахарактарызаваць двух галоўных герояў апавядання — Змітрака і Ромку. Ці апісвае аўтар іх знешні выгляд? *(Не.)* Узрост? *(Так. Змітрок старэйшы за Ромку.)* Ці называе рысы характару хлопчыкаў? *(Не.)* А ці можам мы пра іх здагадацца? *(Так.)* Па чым? *(Па іх учынках.)*

Словы для характарыстыкі герояў можна размясціць на дошцы на картках. Дзеці выбіраюць патрэбнае слова, размяшчаюць у адпаведным слупку табліцы, даказваюць радкамі з тэксту сваю думку.

У выніку можа атрымацца наступная табліца:

| Ромка | Змітрок |
|---|---|
| **Спрытны** *(А Ромка бачком, бачком, ды налева.)*<br><br>**Хітраваты** *(Усе прама пайшлі... А Ромка бачком, бачком, ды налева.)*<br><br>**Уважлівы, назіральны** *(Ромка адразу крок прыцішыў, прыгнуўся крыху, пачаў уважліва заглядваць пад елачкі ды разграбаць прыўзнятыя лісточкі.)*<br><br>**Прагны, няўдзячны** *(Але Ромка не адгукнуўся. "Яшчэ сюды прыбягуць і мае баравікі пахапаюць," — думаў ён.)*<br><br>**Асцярожны** *(Галасы Змітрака, Валодзі і Мані сталі ледзь чутныя. Ромка спалохаўся і пабег да сяброў.)*<br><br>**Падманшчык** *(— Заблудзіўся я, — зманіў Ромка і апусціў долу вочы. — Адышоў ад вас і заблудзіўся.)*<br><br>Яму ўласціва **пачуццё сораму** *(Ромку было няёмка перад сябрамі. Ён ішоў за імі, апусціўшы галаву.)*<br><br>**Хвалько** *рус. хвастун (Але настрой яго адразу ўзняўся, калі ўвайшлі ў вёску. — Глядзі ты, — дзівілася маці, — такі малы, а поўны кошык баравічкоў набраў.)*<br><br>**Несумленны** *рус. бессовестный (Назаўтра Ромка сам да Змітрака пайшоў. Там Валодзю і Маню застаў. З кошыкамі. — І я з вамі! — гукнуў Ромка. — Не, — панура адказаў Змітрок, — мы цябе з сабой не возьмем. — А чаму?)* | **Дружалюбны** *(— Хадзем, — кажа старэйшы Змітрок.)*<br><br>**Клапатлівы** *(— Толькі не адставай ад нас. Каб не згубіўся часам.)*<br><br>**Адказны** *(А дзесьці ў глыбіні лесу крычалі Змітрок, Валодзя і Маня. Яго клікалі. Мы ўсе ногі пазбівалі, цябе шукаючы.)*<br><br>**Разумны, здагадлівы** *(— Дадому час, — спыніў яе Змітрок і звярнуў на дарогу.)*<br><br>**Высакародны, не дробязны** *(Хацеў Змітрок сказаць, што не да баравікоў яму было, што вось гэтага Ромку шукаў, ды змаўчаў.)*<br><br>**Рашучы** *(— Не, — панура адказаў Змітрок, — мы цябе з сабой не возьмем.)* |

**ДРУГІ СІНТЭЗ**

**Настаўнік.** Паспрабуйце працягнуць адно з разважанняў, карыстаючыся табліцай:

*Я хацеў бы мець такога таварыша, як Змітрок, таму што...*

*Я не хацеў бы мець такога таварыша, як Ромка, таму што...*

Ці мог бы быць у апавядання другі працяг? Ці маглі б дзеці ўзяць Ромку з сабой? Пры якой умове? Прыдумайце сваю канцоўку апавядання. *(Апавяданне па ўяўленні.)*

Калі б вы сустрэліся з Ромкам, то якую з прапанаваных прыказак вы б яму назвалі? Чаму?

- *Сябрамі не кідаюцца.*
- *Як гукнеш, так і адгукнецца.*
- *Адзін за ўсіх, усе за аднаго.*

Чаму вучыць нас гэтае апавяданне?

Такім чынам, выкарыстанне эўрыстычнага метаду на ўроках літаратурнага чытання дазваляе рабіць паглыблены аналіз тэксту, ажыццяўляць пошук вырашэння праблем, пашыраць змест вывучаемага матэрыялу, фарміраваць у вучняў першапачатковыя веды пра літаратуру.

*ЛІТАРАТУРА*

1. Варапаева В. С., Куцанава Т. С. Літаратурнае чытанне. 3 клас. — Мінск : НІА, 2013.
2. Вольскі А. В., Гімпель І. А. Літаратурнае чытанне. 3 клас. Ч. 1. — Мінск : НІА, 2012.
3. Ворожбитова, А. А. Начальное лингвориторическое образование: Методика преподавания русского языка : таблицы, схемы, алгоритмы : учебно-методическое пособие / А. А. Ворожбитова. — 2-е изд., испр. и доп. — М. : Флинта : Наука, 2002. — 248 с.
4. Кудряшев, Н. И. Взаимосвязь методов обучения на уроках литературы : пособие для учителей / Н. И. Кудряшев. — М. : Просвещение, 1981. — 190 с.

**В. І. СВІРЫДЗЕНКА,**
кандыдат педагагічных навук,
дацэнт кафедры беларускага і рускага мовазнаўства
БДПУ імя Максіма Танка.